Нужно улучшить положение детей в юношеских домах, усилить борьбу с нищенством, лучше осветить окраины города, проследить за работой вечерних школ. В школе холодно и темно.

Эти дополнения работницы внесли в наказ депутатам Горсовета.

В Горсовет избраны работницы: Закревская, Рагинская, Тринфельд и Зеликман.

А. Вольфсон.

г. Бобруйск.

Нас водкой не споишь.

Делегатское собрание, проработав беседу о советской власти, решило принять активное участие в кампании перевыборов советов. Для этого делегатки собрались в партийную ячейку, где им рассказали, чем могут помочь делегатки в этой кампании.

Делегатки разделились на две группы и пошли по деревням; когда пришли в одну деревню, крестьянки встретили делегаток очень дружелюбно. Долго дружно беседовали. Делегатки раз'ясняли крестьянкам, почему им необходимо участвовать в перевыборах советов. Крестьянки высказывали свои жалобы и обиды. Жаловались на то, что на них мало обращают внимания, не дают высказываться. Получив нужные ответы, крестьянки сказали:

„Теперь мы все пойдем на перевыборы советов и не допустим, чтоб кулак пролез в наши советы. Нас водкой не споишь“.

Бодро возвращались делегатки домой. Они решили чаще ходить в деревню к крестьянкам.

Сазановская.

Зав. „Новка“.

Жанчыну—у саветы!

(Вёска Рачча, Круглянскага раёну, Аршанчына).

Да мінулага году жанчыны нашае вёскі мала прысутнічалі на сходах. Сяброў савету жанчын ад нашай вёскі ў мінулым годзе ня было. У селётнім годзе жанчыны прынялі актыўны ўдзел у перавыбарах саветаў. І што мы бачым. У сябры савету з нашае вёскі абрана адна жанчына і адна ў рэвізійную камісію.

Зеньковіч Мікола Андрэеў.

Далой чадру!

РАЗГРОМ



(Окончание).

Он говорит—дозор... Да, да, дозор... У него такая круглая и добрая голова, как у моего сына, и, конечно, нужно послать дозор, а уж потом спать... спать... и даже не такая, как у моего сына, а... что?..“

— Что ты сказал?—спросил он вдруг, подняв голову.

Рядом с ним ехал Бакланов.

— Я говорю, надо бы дозор послать.

— Да, да, надо послать, распорядись, пожалуйста...

Через минуту кто-то обогнал Левинсона усталой рысью,—Левинсон проводил глазами сгорбленную спину и узнал Мечика. Ему показалось что-то неправильное в том, что Мечик едет в дозор, но он не смог заставить себя разобраться в этой неправильности и тотчас же забыл об этом. Потом еще кто-то проехал мимо.

— Морозка!—крикнул Бакланов вслед уезжавшему,—Вы всетаки не теряйте друг дружку из виду...

„Разве он остался в живых?—подумал Левинсон.—А Дубов погиб... Бедный Дубов... Но что же случилось с Морозкой?.. Ах, да—это было с ним вчера вечером. Хорошо, что я не видел его тогда“...

Дорога вилась по влажным косогорам, густо заросшим дубняком и кленом, еще хранившими багряную листву. Нивка пугливо вздрагивала и жалась к кустам. На под‘еме она пошла шагом. Мечик, задремавший в седле, больше не трогал ее. Иногда он приходил в себя и с недоумением видел вокруг все ту же непроходимую чащу. Ей не было ни конца ни начала, как не было ни конца ни начала тому сонному, тупому, не связанному с окружающим миром состоянию, в котором он сам находился...

Вдруг Нивка испуганно фыркнула и шарахнулась в кусты, прижав Мечика к каким-то гибким прутьям... Он вскинул голову, и сонное состояние мгновенно покинуло его, сменившись чувством ни с чем не сравнимого животного ужаса: на дороге в нескольких шагах от него стояли казаки.

Когда Левинсон услышал выстрелы,--они прозвучали так неожиданно и были так невозможны в теперешнем его состоянии, что он даже не воспринял их. Он только тогда понял их значение, когда раздался залп по Морозке, и лошади стали, как вкопанные, вскинув головы, насторожив уши.

Он беспомощно оглянулся, впервые ища поддержки со стороны, но в том едином, страшном немо-вопрошающем лице, в которое слились для него побледневшие и вытянувшиеся лица партизан,—он прочел то же единственное выражение беспомощности и страха... „Вот он—то, чего я боялся“,—подумал он и сделал такой жест рукой, точно искал и не нашел, за что бы ухватиться...

И вдруг он совершенно отчетливо увидел перед собой простое, мальчишеское, немного даже наивное, но черное и погрубевшее от усталости и дыма лицо Бакланова. Бакланов, держа в одной руке револьвер, в другой крепко вцепившись в лошадиную холку, так что на ней явственно отпечатались его короткие мальчишеские пальцы, — напряженно смотрел в ту сторону, откуда прозвучал залп. И его наивное скуластое лицо, слегка подавшееся вперед, выжидая приказа, горело той подлинной и величайшей из страстей, во имя которой сгибли лучшие люди из их отряда.

Левинсон вздрогнул и выпрямился, и что-то больно и сладко зазвенело в нем... Вдруг он выхватил шашку и тоже подался вперед с заблестевшими глазами.

— На прорыв, да?—хрипло спросил он у Бакланова, неожиданно подняв шашку над головой, так что она вся засияла на солнце. И каждый партизан, увидев ее, тоже вздрогнул и вытянулся на стременах.

Бакланов, свирепо покосившись на шашку, круто обернулся к отряду и крикнул что-то, пронзительное и резкое, чего Левинсон уже не мог расслышать, потому что в это мгновение,—подхваченный той внутренней силой, что управляла Баклановым и что заставила его самого поднять шашку,—он помчался по дороге, чувствуя, что весь отряд должен сейчас кинуться за ним...

Когда через несколько минут он оглянулся, люди действительно мчались следом, пригнувшись к седлам, выставив стремительные подбородки, и в глазах у них стояло то напряженное и страстное выражение, какое он видел у Бакланова.

Это было последнее связное впечатление, какое сохранилось у Левинсона, потому что в ту же секунду что-то ослепительно-грохочущее обрушилось на него—ударило, завертело, смяло,—и он, уже не сознавая себя, но чувствуя, что еще живет, полетел над какой-то оранжевой, кипящей пропастью...

Тут он впервые услышал стрельбу и понял, что это стреляют по ним,—пули густо визжали над головой,—но он понял также, что это стреляют сзади и что самый страшный момент тоже остался позади. В это мгновение еще два всадника поравнялись с ним. Он узнал Варю и Гончаренко. У подрывника вся щека была в крови. Левинсон вспомнил об отряде и оглянулся, но никакого отряда не было: вся дорога была усеяна конскими и людскими трупами, несколько всадников, во главе с Кубраком, с трудом поспешили за Левин-

соном, дальше виднелись еще небольшие группки, они быстро таяли. Кто-то, на хромающей лошади, далеко отстал, махал рукой и кричал. Его окружили люди в желтых околышах и стали бить прикладами,—он пошатнулся и упал. Левинсон сморщился и отвернулся.

В эту минуту он, вместе с Варей и Гончаренко достиг поворота, и стрельба немного утихла; пули больше не визжали над ухом. Левинсон машинально стал сдерживать жеребца. Партизаны, оставшиеся в живых, один за другим настигали его. Гончаренко насчитал девятнадцать человек—с собой и Левинсоном. Они долго мчались под уклон, без единого всзгласа, упершись затаившими ужас, но уже радующимися глазами в то узкое, желтое, молчаливое пространство, что стремительно и одиноко бежало перед ними, как рыжий загнанный пес.

Постепенно лошади перешли на рысь, и стали различимы отдельные обгорелые пни, кусты, верстовые столбы, ясное небо вдали над лесом. Потом лошади пошли шагом.

Левинсон ехал немного впереди, здаумавшись, опустив голову. Иногда он беспомощно оглядывался, будто хотел что-то спросить и не мог вспомнить, и странно, мучительно смотрел на всех долгим, невидящим взглядом. Вдруг он круто осадил лошадь и обернулся и впервые совершенно осмысленно посмотрел на людей своими большими, глубокими, синими глазами. Восемнадцать человек остановились, как один. Стало очень тихо.

— Где Бакланов?—спросил Левинсон.

Восемнадцать человек смотрели на него молча и растерянно.

— Убили Бакланова...—сказал, наконец, Гончаренко и строго посмотрел на свою большую, с узловатым пальцами, руку, державшую повод.

Варя, ссутулившаяся рядом с ним, вдруг упала на шею лошади и громко, истерически заплакала,—ее длинные растрепавшиеся косы свесились чуть не до земли и вздрагивали. Лошадь устало повела ушами и подобрала отвисшую губу. Чиж, покосившись на Варю, тоже всхлипнул и отвернулся.

Глаза Левинсона несколько секунд еще стояли над людьми. Потом он весь как-то опустился и с'ежился, и все вдруг заметили, что он очень ослаб и постарел. Но он уже не стыдился и не скрывал своей слабости; он сидел, потупившись, медленно мигая длинными мокрыми ресницами, и слезы катились по его бороде... Люди стали смотреть в сторону, чтобы самим не расстроиться.

Левинсон повернул лошадь и тихо поехал вперед. Отряд тронулся следом.

— Не плачь уж, чего уж...—виновато сказал Гончаренко, подняв Варю за плечо.

Всякий раз, как Левинсону удавалось забыться, он начинал снова растерянно оглядываться и, вспомнив, что Бакланова нет, снова начинал плакать.

Так выехали они из леса—все девятнадцать.

Лес распахнулся перед ними совсем неожиданно—простором высокого голубого неба и яркорыжего поля, облитого солнцем и скошенного, стлавшегося на две стороны, куда хватал глаз.

Левинсон обвел молчаливым, влажным еще взглядом это просторное небо и землю, сулившую хлеб и отдых, этих далеких людей на току, которых он должен будет сделать вскоре такими же своими, близкими людьм, икакими были те восемнадцать, что молча ехали следом,—и перестал плакать, нужно было жить и исполнять свои обязанности.

1925—26 г.

На прорыв, да?

Падвоім ураджай

(Гутарка агранома).

Сёньня мы пагаворым аб тым, як можна атрымаць раньнюю і ўдалую гародніну.

Табак, памідоры, раньнюю капусту і цыбулю на расаду трэба сеяць у канцы сакавіка, каб магчыма было не пазьней паловы мая высадзіць расаду ў граду.

У сакавіку высяваюць толькі тую частку капусты, якую жадаюць мець пасьпелай у ліпені м-цы, а для запасаў на зіму можна сеяць у канцы красавіка.

У каго няма парнікоў, раньнюю расаду выганяюць у хаце. Для гэтага робяць скрынку шырынёю ў 8 вяршкоў, а даўжынёю—14 вяршкоў, у скрынку набіраюць гародняй зямлі, высяваюць насеньне і ставяць каля вакна, так каб было дастаткова сьвету. У залежнасьці ад таго, колькі патрэбна расады, столькі робяць і скрынак. Напрыклад, у скрынцы раней сказанага разьмеру, можна вырасьціць каля 500 каліваў расады капусты, ці 250—памідораў, 300—тутуну, альбо 800 каліваў цыбулі.

Сеяць трэба не шкадуючы насеньня, а калі ўсходы будуць вельмі густыя, то пасьля неабходна прарываць, так каб адлегласьць аднаго каліва ад другога была: капуста—каля паўтара вяршка, памідоры—3 чвэрці, тутун—таксама, цыбуля—каля чвэрці вяршка. Пасеянае трэба штодзенна паліваць, але ня зусім студзёнай вадою.

Дзён праз 10—12, калі расада зноў падрасьце і загусьцее, трэба перасадзіць яе ці ў другія скрынкі, ці ў цёплыя расаднікі.

Як зрабіць цёплы расаднік.

Цёплы расаднік зрабіць вельмі проста кожнаму. Для гэтага каля сьцяны, ці шчыльнага плоту, з паўдзённага боку робяць яму, глыбінёю—12 вяршкоў, а шырыня павінна быць—2 з паловай аршыны.

Расаднік трэба рабіць абавязкова каля сьцяны, каб была абарона ад поўначы і лепш прыпякала сонца.

Паверх ямы кладуць зьбітыя дошкі. Дзён за 4—5 да высадкі расады, прыблізна каля 10 красавіка, у яму кладуць гной з-пад коняй. Пласт гною павінен быць 10 вяршкоў. Гной трэба добра растрасаць, каб ён быў рыхлым і гарэў. Вельмі добра дзён за 3 да набіўкі вывезьці гной да расадніка, скласьці ў кучу, а калі з яго пойдзе пара—набіваць расаднік. Калі конскага гною няма, то можна скарыстаць гной з-пад каровы. Такі самы цёплы расаднік можна зрабіць у скрынцы.

Пасьля гэтага расаднік зьверху накрываюць рагожаю ці мяхамі, А праз 2—3 дні гной трэба добра ўтаптаць нагамі, лепш за ўсё даручыць гэта падлетку гадоў 14—16. На ўтаптаны гной зьверху насыпаюць загадзя нарыхтаванай добрай зямлі, пласт таўшчынёю 3—4 вяршкі, і расаднік зноў закрываюць зьверху. На другі дзень зямлю трэба параўняць. Трэба памятаць, што расаднік такі рыхтуюць за 6 дзён да высадкі.

На плошчы 1 квадратовага аршыну зьмяшчаюць 250 каліваў капусты, памідораў—50, тутуну—75, а калі высаджваюць цыбулю, то можна зьмясьціць каля 1000 каліваў. Пасьля пасадкі, трэба добра паліць вадою з лейкі, ці з вядра—пры дапамозе веніка.

Як садзіць расаду.

Садзіць расаду трэба так: у расадніку робяць баразёнкі на адлегласьці 1 вяршка для капусты і 2 з паловай вяршкі—калі трэба садзіць памідоры. На такой самай адлегласьці калочкам робяць ямкі і перасаджваюць расаду.

Трэба сачыць за тым, каб расаду не пашкодзіў мароз. У цёплы, сонечны дзень, расаднік адчыняюць, а ўвечары—зноў зачыняюць.

Лекцыя агранома ў доме селяніна.

Зямля павінна быць вільготная, для гэтага яе трэба паліваць штодзённа, ці праз дзень. калі завядзецца зельле, трэба яго прапалоць.

У такім выглядзе расада застаецца да высадкі ў граду. Капусту высаджваюць тады, калі ў ёй будзе 6—7 лістоў. Памідоры і тытун высаджваюць у граду тады, калі няма ніякай небясьпекі ў замаразках. Памідоры можна высадзіць нават у цьвяту.

Як зрабіць халодны расаднік.

Для капусты, якая будзе загатоўвацца на зіму, і бруквы робяцца халодныя расаднікі, альбо паравыя градкі. Засяваюць іх 10—15 красавіка. Пажадана, каб спачатку насеньне засявалася ў хаце, а пасьля перасаджваць яго ў халодны расаднік, каля 25-га красавіка. Халодны расаднік робяць таксама каля сьцяны з паўднёвага боку. Пасьля ўскапваюць градку, глыбінёю 4—5 вяршкоў, абводзяць яе дашчаною скрынкаю, замацаваўшы кольлямі. Рыхлую зямлю з скрынкі выкідаюць, уніз накладаюць пласт гною 3—4 вяршкі (лепш за ўсё конскага), на гной кладуць выкінутую зямлю, крыху прыпадняўшы скрынку ад зямлі.

Высаджваюць расаду таксама, як сказана раней. Нанач трэба расаднікі прыкрываць, каб ня згубіў мароз, а на дзень адчыняць. Вельмі добра, калі для пакрываньня расаднікаў маюцца шкляныя рамы, але калі няма, то можна закрываць звычайнымі мяхамі. Пасаджанае трэба штодзённа паліваць.

Перад высадкай расады ў граду, дзён за 4—5 расаду нанач не накрываюць. Гэта робіцца для таго, каб яна прывыкла да начных халадоў і не папсавалася.

Аграном **Сізоў**.

Увага перавыбарам сельска-гаспадарчае кааперацыі.

У сувязі з задачай перабудовы сельскай гаспадаркі, павышэньня ураджайнасьці, на сельска-гаспадарчую кааперацыю ўскладаецца вялізарная задача.

І справу каляктывізацыі сельскае гаспадаркі — арганізацыя калгасаў, розных відаў кааперацыйных аб'яднаньняў, справа дапамогі беднаце і маламоцнаму серадняку ў паляпшэньні сельскае гаспадаркі праз крэдытаваньне—усё гэта залежыць ад таго, на колькі добра будзе працаваць сельска-гаспадарчая кааперацыя. Хто будзе працаваць у яе кіруючых ворганах. Вось чаму перавыбары кааперацыі набываюць асабліва важнае значэньне.

Гэтыя перавыбары будуць праводзіцца ў сакавіку—красавіку. У гэту кампанію партыя і кааперацыя ставіць сваёй мэтай дамагчыся таго, каб палепшыўся склад кааперацыйных арганізацый, каб ачысьціць іх ад кулакоў, каб у склад кіруючых ворганаў увашоў выключна бядняцка-серадняцкі актыў.

У выніку гэтай кампаніі неабходна павысіць удзел беднаты ў складзе кіруючых ворганаў кааперацыі. У час перавыбараў трэба будзе жорсткай мятлой выгнаць з кааперацыі ўсіх растратчыкаў, усіх чуждых нам людзей, якія перакручваюць лінію партыі ў рабоце кааперацыі. Неабходна асабліва праверыць, ці правільную лінію праводзіла кааперацыя ў выдачы крэдыту, ці выдаўся ён тым, хто мае права, яго атрымаць. Ці правярала кааперацыя як скарыстоўваўся гэты крэдыт.

Пры праверцы работы кааперацыі неабходна праглядзець, як кааперацыя разгарнула сваю работу да вяснавой сяўбы, што робіць яна для ўзмацненьня хлебазарыхтовак.

Асаблівую ўвагу працоўныя сялянкі пры перавыбарах кааперацыі павінны зьвярнуць на тое, каб жанчына заняла большае месца ў сельска-гаспадарчай кааперацыі. На нарадзе жаночых працаўнікоў, якую праводзіў жаночы аддзел ЦК КПБ, высьветлілася, што і дагэтуль у гэтай галіне жанчына займае вельмі нязначнае месца. Возьмем, напрыклад, малочную кааперацыю, якая зьяўляецца найбольш блізкай сялянцы, ў якой яна павінна заняць пераважнае месца. Па дырэктывам усебеларускага зьезду малочнай кааперацыі павінна быць уцягнута ў малочную кааперацыю 25 проц. жанчын. Замест гэтага мы маем кааперыраваных толькі 12 проц. На гэтай самай нарадзе высьвятлілася, што жанчына займае вельмі нязначнае месца ў садова-гародніцкай кааперацыі і льнаводчаскай. Мала кааперыравана жанчын нават тых, якія зьяўляюцца самастойнымі кіраўнікамі гаспадарак.

Перавыбары сельска-гаспадарчай кааперацыі сялянкі павінны скарыстаць для большага ўступленьня ў кааперацыю. Трэба дамагчыся асабліва, каб кожная самастойная гаспадыня была сябрам кааперацыі. Неабходна шырэй разгарнуць арганізацыю малочных, ільнаводных таварыстваў. *Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на большае ўцягненьне ў кааперацыю бяднячак*, якія могуць скарыстаць фонд па каапэраваньню беднаты; за гэта трэба ўзяцца дэлегацкім сходам. На перавыбарчых сходах, дзе кааператывы будуць рабіць справаздачу, абавязкова павінны прысутнічаць усе бяднячкі і сераднячкі, нават калі яны і не зьяўляюцца пайшчыкамі гэтай кааперацыі. Калі адзін з сябраў двара зьяўляецца пайнікам сельска-гаспадарчай кааперацыі, то ўсе астатнія сябры двара маюць права прысутнічаць на справаздачным сходзе. Сялянкам трэба скарыстаць гэта права прымаць удзел у абгаварэньні справаздач кіраўніцтв кааперацыі, сьмела выкрываць ўсе недахопы.

У гэту кампанію *трэба дамагчыся рашучага пералому ў справе ўцягненьня жанчын у кіруючую работу кааперацыі*, дзе дагэтуль сялянак вельмі мала.

Калі бяднячка і сераднячка будзе бліжэй да працы сельска-гаспадарчай кааперацыі, гэта дапаможа працоўнаму сялянству праз сел-гаспадарчую кааперацыю паднімаць сел.-гаспадарку і паляпшаць быт самой сялянкі.

М.

Гутарка дэлегаткамі

(Аб павышэньні ўраджайнасьці і падрыхтоўцы да веснавой сяўбы).

— Неяк трохі марудна зьбіраўся дэлегацкі сход. Мароз сібірны,—кажа Матруна да свае суседкі.

У кутках, на лаўках, сабраўшыся гаварылі між сабою аб усім патроху...

— Аб чым-жа гэта сёньні гутарыць будзем?—запытала Кацярына.

— А вось прачытаем.

— Як гэта?

— Аб павышэньні ўраджайнасьці і падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

— А,—махнула рукою Ганна,—што там падымаць: у мяне зямля—адзін пясок, гною няма...

— Пэўна так,—згадзілася Хвядося.

— Гэта хлусьня, што нічога нельга зрабіць,—адазвалася Матруна. — Вось вам такі прыклад: Мікалаяў Зьміцер засеяў у сябе 2 гэктары аўсом. Адзін гэктар быў засеяны адсартаваным насеньнем, а другі—неадсартаваным. І вось вынікі:—там, дзе насеньне было адсартованае—ён атрымаў з гэктараў 8 з паловай цэнтнераў аўса, а неадсартаванае дало яму толькі 6 цэнтнераў. Такім чынам сартаваньне насеньня павысіла ўраджайнасьць на 25 процантаў.

— Ну, дык гэта ў яго выпадкова вышла,—ня сунімалася Ганна.

— Чаму выпадкова, — няўцерпела Матруна. — Вось у мяне з бульбай.

Прышоў гэта мой Хведар з сельска-гаспадарчага гуртка і кажа: „Давайце, мама, сеяць бульбу, як нам сёньні аграном казаў". Я спачатку і не хацела, бабанькі, згаджацца з ім. А пасьля крыху падумала: давай паспытаю.

— „Глеба ў мяне на полі—суглінкавая, а пагэтаму гной паклалі з восені. Пазьней, у восень мы глыбака ўзаралі. Вясною, як толькі зямля прасохла, забаранавалі. Праз некаторы час, калі глеба стала больш шчыльнай і павылазіла зельле—зноў мы глыбака ўзаралі. А неўзабавае яшчэ раз забаранавалі. У маі на гэтай плошчы мы рассыпалі 10 пудоў попелу і ў той самы дзень пад плуг пасадзілі 20 пудоў бульбы. Бульбу кідалі не на самае дно ральлі, а на скібу, у пухкую зямлю. З усяе колькасьці раскіданай бульбы 15 пудоў было пакідана цэлымі, а 5 парэзанай. Садзілі ў прагрэтую глебу. Праз 3 дні—прабаранавалі. Праз некаторы час прабаранавалі ў другі раз, бо ўжо пачалі вылазіць лісьцікі бульбы. Калі расткі бульбы падняліся на 2—3 вяршкі, мы зрабілі плужком няглыбока акучваньне. За лета я зрабіў яшчэ некалькі акучваньняў, а зельле час ад часу палолі. І вось замест 20 пудоў бульбы мы накапалі 400 пудоў здаровай удалай бульбы.

— Можа і так, а мы яшчэ цёмныя, мала чаго ведаем,—уздыхнуў казала Ганна.

Аграном амаль што ў нашай вёсцы за ўвесь час толькі адзін разочак пабываў.

— Гэта так. Нам, бабанькі, абавязкова трэба сёньні на сходзе патрабаваць, каб прыслалі да нас агранома, каб ён нам растлумачыу усё, як сапраўды можа наша зямелька пабольш радзіць.

— Вось, гэта так,—адазваўся за плячыма Ганны т. Васільлёў—кіраўнік дэлегацкага сходу.

— Вось, сёньні пагутарым аб рашэньні ўраду СССР і БССР па падняцьці ўраджайнасьці, а ў наступны раз сапраўды трэба запрасіць агранома.

— І вось, таварышы, згодна пастановы ўраду, на працягу бліжэйшых пяці год трэба павысіць ураджайнасьць нашых палёў па ўсяму Саюзу Савецкіх Рэспублік *на 30—35 процантаў*, а па нашай Беларусі—*на 45 процантаў*. Для гэтага ўрад вынес спэцыяльную пастанову аб тым, каб за гэтыя 5 год у нашай сельскай гаспадарцы абавязкова праводзіць:

„Сяўбу гатункавым насеньнем, ачыстку і сартаваньне ўсяго насеньня, радкавую сяўбу, скасаваньне меж, барацьбу са шкоднікамі і пустазельлем, якія робяць штогодна на мільярд руб. шкоды; пашырэньне палепшаных спосабаў выраблеңня зямлі; спыненьне пашы жывёлы на азіміне; паляпшэньне ўтрыманьня і харчаваньня жывёлы; больш правільнае скарыстоўваньне гною, як угнаеньне; больш поўнае скарыстоўваньне інвэнтару ў сялянскіх гаспадарках, калгасах, саўгасах, пракатных пунктаў, рамонтных майстэрняў; магчыма большае ўжываньне фасфарытнае мукі, вапны і попелу, як угнаеньня, а таксама зялёнага ўгнаеньня і г. д.".

Таксама ўрад парашыў да канца пяцігодзьдзя значна пашырыць дзяржаўны фонд гатунковага насеньня і каб саўгасы, калгасы і камуны ўсё гатунковае збожжа скарысталі выключна на насеньне як для сваіх, так і для суседзкіх патрэб.

Урад парашыў у большай ступені скарыстоўваць дасягненьні дасьледчых станцый, больш шырака распаўсюджваць агранамічныя веды, і праз выезды і гутаркі аграномаў кароткатэрміновыя курсы прасоўваць у вёску навукова-папулярную танную літаратуру і пр.

Вось, таварышы, каб праводзіць у жыцьцё пастановы Ўраду. каб правільна скарыстоўваць тыя грошы, якія Ўрад выдаткоўвае на паляпшэньне сельскай гаспадаркі, нам патрэбна ўзмацніць актыўнасьць працоўнага сялянства Беларусі, а ў першую чаргу батрачак і бяднячак. Вось тут цётка Ганна скардзілася, што гною няма. Гэта праўда, але ў нас шмат дабра гіне і не скарыстоўваецца. Вось, напрыклад, звычайны попел: ён вельмі карысны для ўгнаеньня, а мы яго заўсёды выкідваем.

У збору попелу нам дапамогуць работніцы гораду. Вось Менскі Акрвыканком выдаў пастанову

аб абавязковым зборы попелу ўрадавымі і кааператыўнымі ворганамі, гэты попел праз зямельныя адзелы будзе перадавацца пасёлкам і асобным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам. Таксама работніцы ў сябе дома зьбіраюць попел на патрэбы сялянак. На гэтай галіне можна многа зрабіць. Нам, таварышы, трэба паступова праводзіць у жыцьцё пастановы ўраду. Сучасны момант патрабуе ад нас безадкладна прасачыць за тым, *каб перачысьціць насеньне і праз збожжаачысныя абозы* і ў бліжэйшых саўгасах, камунах, калгасах. Часткова можна скарыстоўваць і прыватныя машыны. Дэлегаткі павінны зараз-жа паглядзець, ці сельсаветы, Райвыканкомы, КСУ, зрабілі ўсё, што ад іх залежыць, у сваечасовай падрыхтоўцы да вясновае сяўбы. Трэба прасачыць, каб саўгасы і камуны ўсю рэшту гатунковага збожжа ні ў якім разе не скарыстоўвалі для сваіх патрэб на хлеб, а абмянялі з сялянскай беднатой на насеньне. За гэта павінны ўзяцца дэлегаткі-калгасніцы і саўгасніцы.

Вось тыя прыклады, якія тут прыводзілі раней тав. дэлегаткі, павінны ўцяміць усе дэлегаткі. Вы павінны растлумачыць усім сялянкам аб мерапрыемствах ураду і дапамагаць праводзіць усё гэта ў жыцьцё.

—Кіраўнік добра кажа. Але-ж як рыхтавацца, калі няма ні насеньня, ні каня — нічога, — запыталася Марыля.

Трэба, тав., зараз-жа зьвярнуцца ў КСУ і атрымаць семянную ссуду. Трэба дабіцца грамадзкай запашкі палёў адзіночак, удоў, бяднячак.

Бачу я, тав., што большасьць дэлегатак добра зразумее пастановы ўраду і, бязумоўна, будуць праводзіць гэта ў жыцьцё, прыцягнуць да гэтага шырокія масы батрачак, с.-г. работніц, бяднячак і сераднячак.

— Гэта правідлова—сказала Кацярына. Нам, дэлегаткам, трэба ў першую чаргу самым ачысьціць насеньне і прасачыць каб, уся беднота нашай вёскі так зрабіла.

Гэту прапанову дэлегаткі прынялі.

— Добра казаў—т. Васільлеў,—а ў наступнай гутарцы аграном вам растлумачыць больш падрабязна, што і як сеяць сёлета.

Б. Дварэцкая.

Увага. Гэктар гэта 9/10 дзесяціны. Цэнтнер—6 пудоў.

Не марудзіць з падрыхтоўкай да вясеньняй сяўбы.

(Рудзенскі с.-с., Сьмілавіцкага раёну).

Нашаму сельсавету ў гэтым годзе трэба сваечасова падрыхтавацца да вясеньняе пасяўной кампаніі, каб не зрабіць памылак мінулага году, калі сяляне сеялі неачышчанае насеньне.

У гэтым годзе на агульным перавыбарчым сходзе сялян у пасёлку Галанбэрак, Дукорскага с.-с., Сьмілавіцкага раёну, сялянкі вынесьлі прапанову наконт ачышчэньня насеньня, тады і наш старшыня Дукорскага с.-с. Сенчук згадзіўся кольвек-што зрабіць. Пастанавілі на агульным сходзе, каб трыер абслужыў усе вёскі гэтага сельсавету.

Шмат ёсьць цёмных неразумных мужчын, якіх жонка гоніць чысьціць насеньне, а ён ня хоча. Трэба каб па прыкладу сялянак пасёлку Галанбэрак, усе вёскі праводзілі ачыстку насеньня. Няхай наш сельсавет хутчэй возьмецца за гэту справу.

Р.

Сяляне вывучаюць пастановы агранамічнага зьезду.

На агранамічным зьезьдзе т. Прышчэпаў з лічбамі ў руках даказаў, што на вопытна-даследчых вучастках Горацкай станцыі дамагліся з дзесяціны 133 п. жыта, 168 пудоў аўса, 1667 пуд. бульбы.

Нават асобныя сяляне-даследчыкі дамагліся 100 пудоў жыта, 96 пуд. аўса і 1133 пуды бульбы з дзесяціны. Гэта ў той час, калі селянін на звычайнай гаспадарцы мае з дзесяціны толькі 40 пудоў жыта, 39 пудоў аўса.

Розьніца між ураджаем вопытнікаў і звычайных сялян вельмі вялікая.

Такія самыя лічбы павялічэньня ўраджаю даюць Менская, Віцебская, Тураўская вопытныя станцыі. А Дрыбенская станцыя дамаглася 256 пудоў жыта з дзесяціны.

Агранамічны зьезд зацікавіў ня толькі ўдзельнікаў зьезду, але ўсё працоўнае сялянства, якое чытае газэты.

Я чула, як некаторыя сяляне казалі: „Я даю адрубаць галаву, што наша дзесяціна зямлі, колькі-б гною ні паклалі мы, то яна ня дасьць такога ўраджаю". Так кажуць больш адсталыя сяляне.

А большасьць працоўнага сялянства ўважліва сачыла за агранамічным зьездам і зараз вывучае яго пастановы, асабліва па пытаньням павышэньня ўраджайнасьці.

Сяляне нашай вёскі зараз запрашаюць агранома прыехаць у вёску Раўнапольле і растлумачыць аб тым, як на месцы мы зможам падняць ураджай.

Кожны селянін і сялянка, а ў першую чаргу актывістка з сёлеташняга веснавога севу павінны ўзяцца за лепшыя формы земляапрацоўкі, перачышчаць насеньне, скарыстоўваць попел і г. д.

М. Роза.

В. Раўнапольле,
Сьмілавіцкага раёну.

Дэлегацкія сходы, сялянкі! Уступайце ў пераклічку аб лепшым удзелу ў правядзеньні веснавое сяўбы.

Поўная перачыстка насеньня дэлегаткамі, зьбіраньне і скарыстоўваньне попелу, пераход да шматпольля.

Дамагайцеся, каб насеньне перачысьціла ўся вёска, кожны селянін, бо калі суседняе поле будзе засеяна не перачышчаным насеньнем, то пустазельле пяройдзе і на ваша поле.

БЕРАЖЫ ЗДАРОЎЕ.

Пухліны маткі.

Хваробы радавых ворганаў у жанчыны сустракаюцца вельмі часта. Яны бываюць самыя розныя: хварэе ўлагалішча, матка, яічнікі і трубы. Хварэюць гэтыя ворганы на розныя запаленьні, пухліны і г. д.

Гэтыя хваробы бываюць розныя і незаразьлівыя, бываюць лёгкія і вельмі цяжкія. На многа хвароб жанчыны спачатку не зьвяртаюць ніякай увагі і працягваюць сваю штодзённую працу. Часьцей за ўсё жанчыны зьвяртаюцца да ўрача за дапамогай толькі тады, калі хвароба ўжо ўкаранілася і выклікае моцную боль крыватоk, альбо якое-небудзь іншае няпрыемнае зьявішча.

Бывае і так, што хворая жанчына пачынае лячыцца сваімі хатнімі сродкамі, альбо зьвяртаецца за дапамогай да знахаркі, часьцей за ўсё няпісьменнай і вельмі бруднай бабулькі.

Вядома, што перш як лячыць хваробу, трэба дазнацца, якая гэта хвароба. А даведацца, угадаць хваробу (паставіць дыагноз) справа ня зусім лёгкая, нават і для ўрача. І бязумоўна знахаркі „лечаць“ хваробу, ня ведаючы яе. Зразумела, што такое „лячэньне“ да дабра не давядзе, тым больш, што лекавыя сродкі знахаркі заўсёды складаюцца з якіх-небудзь брудных рэчаў. Такое лячэньне ўскладняе хваробу, і ўрэшце маладая, здаровая жанчына ператвараецца ў інваліда.

Для таго, каб хоць трошкі дапамагчы жанчынам пазнаёміцца з тымі хваробамі, якія ў іх сустракаюцца, як ад гэтых хвароб сябе забараніць і што ў выпадку захварэньня патрэбна рабіць, мы будзем зьмяшчаць свае кароткія артыкулы.

Сёньні мы пагутарым толькі аб частцы захварэньняў радавых ворганаў—аб пухлінах.

Пухліны вельмі часта сустракаюцца у радавых ворганах жанчын, але сустракаюцца і ў іншых ворганах цела, напрыклад: у печанёх, страўніку і г. д. Пухліны характарызуюцца тым, што бязупынна растуць. Харчуюцца яны сокамі арганізму. Тыя пухліны, якія растуць марудна, завуцца дабраякаснымі. Тыя-ж, якія растуць хутка,—злаякаснымі. Да дабраякасных пухлін маткі адносяцца міомы, фібраміомы; да злаякасных—саркомы і рак.

Прычынай разьвіцьця пухлін зьяўляюцца розныя раздражненьні радавых ворганаў на працягу жыцьця жанчыны. Гэтыя раздражненьні прымушаюць паасобную каморку таго ці іншага ворагану дзяліцца і расьці. З такой каморкі і утвараецца пасьля пухліна, альбо новаўтварэньне, як яна інакш называецца.

Пухліны растуць вельмі марудна і спачатку ня турбуюць хворую. Толькі тады, калі яны вырастаюць да значнай велічыні, хворая пачынае адчуваць болю ўнізе жывата, альбо ў яе паяўляецца несваечасовы крыватоk. Вельмі часта такая пухліна прымацоўваецца да боку маткі і адхіляе матку ў бок, што ў сваю чаргу выклікае і болю і крыватоk і інш.

Цяжарнасьць пры захварэньні маткі гэтакай пухлінаю магчыма, але часта пухліна выклікае скід. Пры сваечасовых родах пухліна часта перашкаджае павольнаму родаразрашэньню і, каб выратаваць гэтакую хворую і яе дзіцянё, трэба хутка рабіць цяжкую аперацыю (кесарскае сячэньне).

Злаякасныя пухліны маткі—саркома і рак—часьцей за ўсё разьвіваюцца на шыйцы маткі. Растуць яны, як я ўжо казаў, вельмі хутка. Як і дабраякасныя, спачатку яны мала турбуюць жанчыну. Толькі праз некаторы час, калі ў хворае паяўляюцца моцныя белі, крывавыя плямы паміж менструацыямі (месячнымі), а таксама большая працягласьць саміх менструацый, жанчыны зварочваюць увагу на становішча свайго здароўя.

Белі бываюць жаўтаватыя, альбо крывяністай ахворобўкі. Бываюць выпадкі, калі гэтыя белі меюць няпрыемны пах. Спачатку хваробы боляў амаль што ня бывае. Толькі тады, калі рак альбо саркома разрасьцецца і перайдзе на іншыя суседнія ворганы, тады хворая пачынае адчуваць боль, часта вельмі моцную. І гэта прымушае яе шукаць ратунку. Нажаль, вельмі часта бывае, што хворая на рак альбо на саркому зьвяртаюцца да ўрача зусім позна. Яны патрабуюць ад урача дапамогі тады, калі пухліна ўкаранілася і калі зьнішчыць яе няма ніякай магчымасьці. У гэтакай стадыі злаякасныя пухліны лічуцца незьлячымымі хваробамі. І многа жанчын гіне ад гэтага злоснага ворага. Усе пухліны і асабліва злаякасныя—рак і саркома, трэба лячыць спачатку захварэньня.

Лечацца пухліны альбо праменьнямі, альбо хірургічнымі апэрацыямі.

Парады.

Кожная жанчына павінна штодзенна сачыць за сваім здароўем. Я павінна прыслухоўвацца, ці няма ў галіне радавых ворганаў боляў, якіх-небудзь няпрыемных пачуцьцяў. Трэба зварочваць увагу на правільнасьць месячных крыватокаў.

Трэба заўважыць, ці не паявіліся белі і г. д. І калі што-небудзь з пералічанага будзе заўважана, зараз-жа неабходна зварочвацца да ўрача за парадай альбо за дапамогай.

У наступным нумару мы пагутарым аб другіх захварэньнях радавых ворганаў.

Доктар **Хвэд.**

Паштовая скрынка.

Хмялеўскай Х. Матар'ял спазьніўся. Пішыце, як у вас ідзе падрыхтоўка да вясновой сяўбы.

Іанот. Пішыце, якую працу праводзіць ваш гурток дамаводзтва.

Хаміцкай Палаг'і. Рыхтуемся да перавыбараў—спазьнілася. Напішыце аб працы збожжаачысных абозаў.

Жураўлёвай. Аб перавыбарчых сходах матар'ял спазьніўся.

Усім астатнім, якія прыслалі допісы ў „Белрабсялянку“. Многа матар'ялаў мы не зьмяшчаем у гэтым нумары, за адсутнасьцю месца. Усе гэтыя матар'ялы будуць разгледжаны для надрукаваньня ў наступным нумары.

Пяцігадовы лыжнік.

Юзік з дашчанятак зьбіў
Сабе саматужкі.
Таню ў сані пасадзіў,
Даў ёй ў рукі пужку!

Юзік цягне матузок
Саматужкі-бежкі.
Пяе песьню палазок,
Падпяваюць сьнежкі.

А сьняжынкі-матылькі
Лётаюць, парошаць,
Шчыплюць дзецям тва-
рыкі,
Пальчыкі марозяць.

Канапляшік-хахалок
Чык-чырык галосіць.
Па дарожцы скок-скок-
скок,
У дзетак есьці просіць.

Таня ў хату бяжыць грэцца,
Кінула гулянку.
Канапляніка сустрэла
У сябе на ганку.

Праз вакенца Таня жменькай
Птушкам крошкі сыпле.
Птушкі клююць, падбіраюць,
Сьняжок разграбаюць. Г—а.

Друкарня „БДВ". Заказ № 1804. У ліку 10000. Галоўлітбел № 973.